

**Масла Алена Сцяпанаўна** (**Алена Масла)** – пісьменніца.

Нарадзілася 14 красавіка 1967 года ў вёсцы Мілашова Мёрскага раёна Віцебскай вобласці ў сям'і настаўнікаў.

Друкавацца пачала з 10 гадоў, дэбютавала ў часопісе «Бярозка».

Скончыла Мілашоўскую васьмігодку, вучылася ў Мёрскай СШ №2. З 1984 па 1989 гг. - студэнтка БДУ імя Леніна (факультэт журналістыкі). Працавала фотакарэспандэнтам у газеце «Піянер Беларусі» («Раніца»), рэдактарам краязнаўчага атдзела ў газеце «Туризм и отдых», рэдактарам аддзела часопіса «Качели», галоўным рэдактарам газеты «Переходный возраст». З 2006 года – загадчык рэдакцыі дзіцячай літаратуры выдавецтва «Мастацкая літаратура».

Алена Масла піша казкі для дзяцей і падлеткаў. Жыццё ўспрымае як казку з рознымі прыгодамі і здарэннямі, але абавязковай перамогай Дабра.

Аўтар кніг: «Рождество у крёстной» (2005г.), «Таямніца закінутай хаты» (2005г.), «Вандроўка з божымі кароўкамі» (2007г.), «Першая прыгажуня» (2010г.), «Як пані Чаротная на госці ў Палангу бегала» (2010г.), «Пацучок Фэлік падарожнічае» (2013г.).

Выступае ў СМІ з публікацыямі на тэму развіцця беларускай дзіцячай літаратуры. Кнігі Алены Масла рэгулярна адзначаюцца сярод лепшых твораў для дзяцей. У 2007 годзе яна атрымала «Пасведчанне чытацкіх сімпатый» па выніках рэйтынгу газеты «Наша ніва». Вызначаліся яе кнігі: «Таямніца закінутай хаты» (2005 г.), «Вандроўка з божымі кароўкамі» (2007г.) – па выніках конкурсу «Лепшая беларуская кніга» (Беларуская бібліятэчная асацыяцыя).

Лаўрэат літаратурнай прэміі «Залаты купідон» у намінацыі «Дзіцячая літаратура» (2010г.)

Плённа супрацоўнічае з выдавецтвам «Пачатковая школа».